# ПЛАНЕТА Ў ПАДЗЕЯХ

# Лацінская Амерыка павінна стаць бяз'ядзернай зонай

**Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. В. КІСЯЛЁВА на пасяджэнні Палітычнага камітэта XVIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па пытанню аб аб'яўленні Лацінскай Амерыкі бяз'ядзернай зонай**

Пан старшыня, панове!

Дэлегацыя Беларускай ССР з вялікай увагай сочыць за дыскусіяй па пытанню аб аб'яўленні Лацінскай Амерыкі бяз'ядзернай *зонай*. У сваіх папярэдніх заявах па пытаннях усеагульнага і поўнага раззбраення і забароны выпрабаванняў ядзернай зброі дэлегацыя Беларускай ССР рашуча выказвалася за стварэнне зон, свабодных ад ядзернай зброі. Мы заўсёды лічылі і лічым, што стварэнне бяз'ядзерных зон з'яўляецца важным крокам на шляху аслаблення пагрозы ядзернай вайны. Урад Беларусі нястомна змагаўся і змагаецца за стварэнне бяз'ядзерных зон, ставячы толькі адну мэту: зменшыць небяспеку сусветнай вайны, а затым наогул ліквідаваць яе, дабіўшыся ўсеагульнага і поўнага раззбраення пад строгім міжнародным кантролем. *Іменна таму* мы віталі канферэнцыю кіраўнікоў урадаў афрыканскіх краін, што праходзіла 22—25 мая 1963 года ў Аддыс-Абебе, якія звярнуліся з заклікам да ўсіх дзяржаў паважаць рашэнне аб прызнанні Афрыкі бяз'ядзернай зонай. Як вядома, такое рашэнне было прынята яшчэ XVI сесіяй Генеральнай Асамблеі ААН у рэзалюцыі ад 24 лістапада 1961 года. Савецкі ўрад, як падкрэслівалася ў пасланні М. С. Хрушчова кіраўнікам дзяржаў і ўрадаў афрыканскіх краін, *якія прымалі* ўдзел у гістарычнай канферэнцыі

…най Еўропы, Балтыкі, Балкан, Ціхага акіяна, Міжземнамор'я і г. д.

Што датычыць раёна Міжземнага мора, то Савецкі ўрад яшчэ ў маі г.г. унёс адпаведную прапанову, якую мы лічым вельмі важнай. Савецкая ініцыятыва мае асаблівае значэнне для краін, размешчаных у басейне Міжземнага мора, паколькі Савецкі Саюз выказаў поўную гатоўнасць даць надзейныя гарантыі таго, што раён Міжземнага мора ў выпадку якіх-небудзь ваенных ускладненняў будзе разглядацца як раён, які знаходзіцца па-за сферай ужывання ядзернай зброі. Савецкая ініцыятыва сустрэла разуменне з боку многіх дзяржаў. Здавалася б, павінна было адбыцца дзелавое абмеркаванне прапановы СССР. Але прадстаўнікі заходніх краін у Камітэце 18-ці дзяржаў па раззбраенню проста заявілі, што савецкая прапанова з'яўляецца нібыта «прапагандысцкім крокам» і што яе ажыццяўленне быццам бы парушыць «раўнавагу сіл». Адхіліўшы з парога савецкую прапанову аб аб'яўленні *Міжземнага мора бязатамнай* зонай, заходнія дзяржавы тым самым

…ляцыі. Аднак урады Даніі і Нарвегіі, якія ўваходзяць у НАТО, адхілілі прапановы фінскага ўрада, спаслаўшыся на тое, што гэта пытанне трэба «разглядаць у агульным кантэксце раззбраення».

Прыведзеныя вышэй мною факты сведчаць аб тым, што Савецкі Саюз, сацыялістычныя і многія нейтралісцкія дзяржавы канкрэтна выступаюць за тое, каб пазбавіць чалавецтва ад пагрозы тэрмаядзернай вайны, забараніць ядзерную зброю, спыніць яе распаўсюджванне. Аднак мы вымушаны канстатаваць, што ажыццяўленню гэтых прапаноў усё яшчэ супраціўляюцца ўрады Злучаных Штатаў Амерыкі і іншых заходніх дзяржаў.

Наша дэлегацыя з вялікай увагай учора выслухала выступленне прадстаўніка Кубы Карласа Лечугі, які ўказаў на тое, што пасля ліквідацыі вастрэйшага крызісу абстаноўка ў раёне Карыбскага мора не з'яўляецца нармальнай.

Беларуская дэлегацыя поўнасцю згодна з матывамі, па якіх кубінская дэлегацыя не можа падтрымаць рэза…

…бязатамнай зонай. Мы віталі дэкларацыю ад 29 красавіка 1963 года прэзідэнтаў пяці лацінаамерыканскіх дзяржаў—Бразіліі, Мексікі, Чылі, Балівіі і Эквадора, у якой яны заклікалі аб'явіць Лацінскую Амерыку бяз'ядзернай зонай, з тым, каб «не вырабляць, не атрымліваць, не захоўваць і не праводзіць выпрабаванняў ядзернай зброі і сродкаў яе дастаўкі» на тэрыторыі краін Лацінскай Амерыкі.

Аддаючы належнае высакародным імкненням краін, якія прадставілі праект рэзалюцыі *аб аб'яўленні Лацінскай* Амерыкі бяз'ядзернай зонай, наша дэлегацыя лічыць разам з тым, што гэты праект недастаткова канкрэтна сфармуляван. З праекта незразумела, якія іменна тэрыторыі павінны стаць бяз'ядзернымі. Калі аўтары рэзалюцыі мелі на ўвазе агульнапрынятае геаграфічнае паняцце Лацінскай Амерыкі, то тады незразумела, чаму прадстаўнік Злучаных Штатаў Амерыкі, які падтрымаў гэты праект, не заявіў тут аб гатоўнасці ЗША ліквідаваць свае ваенныя базы на…

…ваць сур'ёзна на якіясьці выключэнні. *Пра гэта, уласна кажучы*, і заявіў тут прадстаўнік Савецкага Саюза Н. Т. Федарэнка. Мы поўнасцю падзяляем думку прадстаўніка Бразіліі пана Бернардэса, які заявіў тут 11 лістапада г. г., што з пункту гледжання праграмы раззбраення ператварэнне Лацінскай Амерыкі ў бяз'ядзерную зону прадстаўляла б меру тэрытарыяльнага ядзернага раззбраення, а з пункту гледжання перспектывы планаў кантролю над узбраеннямі гэта садзейнічала б абмежаванню гонкі ўзбраенняў.

Мы таксама перакананы ў тым, што бяз'ядзерныя зоны — гэта шчасце для чалавецтва. Для таго, каб гэта шчасце было дасягальнае і моцнае, яно павінна грунтавацца на агульнапрымальных рашэннях, якія поўнасцю ўлічвалі б інтарэсы ўсіх зацікаўленых бакоў. Бясспрэчна, што такія рашэнні заўсёды знойдуць падтрымку ўрада Беларускай ССР, які з поўнай увагай і адказнасцю адносіцца да пытанняў захавання і ўмацавання міру, мірнага суіснавання.

Дэлегацыя Беларускай ССР лічыць, што настаў час спыніць распаўсюджванне атамнай і вадароднай зброі. Як ракавая пухліна, разрастаючыся, разбурае здаровую тканку і прыводзіць да смерці, так і гонка ў галіне тэрмаядзернай зброі згубна дзейнічае на здароўе чалавецтва і ў кан…

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы